**Андрыеўскі, В.** 《Афганістан – памяць назаўсёды» / В. Андрыеўскі // Родныя вытокі. — 1997. — 15 лют. — С. 1.

## «АФГАНІСТАН – ПАМЯЦЬ НАЗАЎСЁДЫ”

Так аб ім гаворыць наш зямляк былы воін-інтэрнацыяналіст Валянцін Андрыеўскі. Гэту частку свайго жыцця ён памятае вельмі дакладна. Служыў у Віцебскай дывізіі. З першай адпраўкай я дэсантнікаў трапіў у гэту горную, гарачую краіну на вайну.

– Стаялі ў Кабуле, але ўвесь час хадзілі ў баявыя рэйды, удзельнічалі ў многіх баявых аперацыях. Джэлалабад, Герад, іншыя накірункі. На два тыдні туды, затым вярталіся на дазапраўку – і зноў у дарогу. Бачыў кроў, бачыў смерць. Бачыў галечу, калі ў аулах ішак качаў ваду, а людзі цапамі малацілі. Прывыкнуць да гэтага нельга. Чым больш служылі, асабліва з набліжэннем «дэмбеля», рабілася ўсё страшней. Надта ўжо не хацелася загінуць у канцы службы, – расказвае В. Андрыеўскі.

Аднойчы перад імі выступаў Бабрак Кармаль. І ўжо тады, у 1980 годзе, савецкія салдаты задавалі пытанне: «Калі нашы войскі выведуць з Афганістана?» У адказ пачулі: «Колькі спатрэбіцца, столькі і будзеце тут».

Валянціну давялося служыць у Афганістане год. Кожны дзень там пачынаўся з гучання ранішняй пропаведзі мулы, якая ў 6 гадзін разносілася на ўвесь Кабул. А нашы хлопцы ўспаміналі Радзіму, бацькоў. Недзе далёка іх маці маліліся Богу, каб сыны жывымі і здаровымі вярнуліся дадому.

Іх трымалі ў курсе ўсіх падзей, якія адбываліся ў СССР. Кожную раніцу паведамлялі, колькі чалавек загінула па дывізіі і абавязкова – навіны з Саюза.

Памятае сяржант Андрыеўскі і сваіх армейскіх сяброў. Афганскае братэрства – яно навечна. Сапраўднымі таварышамі былі і салдаты, і афіцэры.

Кажуць, гады лечуць. Крыху сціх боль, зацягнуліся душэўныя раны і ў В. Андрыеўскага. Не стаў «крутым прадпрымальнікам», не папоўніў, што часам бывае, рады крымінальных элементаў. 16 год займаецца ганаровай справай – працуе вадзіцелем «хуткай дапамогі», удзень і ўноч спяшаецца на дапамогу людзям.

Самы прыемны ўспамін Валянціна – аб тым, як вяртаўся дадому. Як ад праяўлення агульнага шчасця захадзіў хадуном ТУ-154, на якім ляцелі 300 дэмабілізаваных ваеннаслужачых, калі паведамілі, што самалёт перасёк граніцу СССР. А 15 лютага 1989 года чужую краіну пакінулі апошнія нашы салдаты. Яны прывезлі адтуль ордэны, медалі, а яшчэ – памяць аб тым часе на ўсё жыццё.

**В. Андрыеўскі**